# СВАБОДА

**БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА** **№ 33 (48), 14–20.12. 2006 г.**

# РАСІЯ АБВЯШЧАЕ ЭКАНАМІЧНУЮ ВАЙНУ БЕЛАРУСІ

## З-ЗА МЫТА НА РАСІЙСКІЯ НАФТАПРАДУКТЫ РБ МОЖА СТРАЦІЦЬ 2 МІЛЬЯРДЫ ДАЛЯРАЎ



**Колькі будзе каштаваць бензін?** *Цэны на паліва на беларускіх аўтазапраўках толькі сёлета падымаліся ўжо некалькі разоў. З 11 снежня літр бензіна А-95 каштуе 2000 рублёў. А якія кошты прынясе наступны год? Мінск, заправачная калонка канцэрна “Белнафтахім”. Фота з архіву.*

12 снежня ўрад Расіі заявіў пра скасаванне льготнага падаткаабкладання экспарту нафты ў Беларусь. Паводле апублікаванай пастановы, з 1 студзеня 2007 году экспарт расійскай нафты ў Беларусь будзе абкладацца такім самым мытам, як і для краінаў, якія не ўваходзяць у Мытны саюз – 180 даляраў за тону. Дагэтуль Беларусь не плаціла ніякага мыта ўвогуле.

У дакуменце, падпісаным Міхаілам Фрадковым, гаворыцца, што рашэнне прынятае “з мэтай абароны эканамічных інтарэсаў Расіі”. Як піша расійская газета “Коммерсант”, пагадненнем паміж Беларуссю і Расіяй, якое дзейнічала з траўня 1995 году, прадугледжвалася, што мыта на экспарт нафты з Беларусі, якое атрымліваў беларускі бюджэт, будзе дзяліцца паміж бюджэтамі дзьвюх краінаў. Але прапорцыя не агаворвалася. Беларускі бок больш за дзесяць гадоў увогуле нічога не пералічваў у расійскі бюджэт.

Газета прыводзіць словы міністра прамысловасці і энергетыкі Расіі Віктара Хрысценкі: “Усе нафтавыя кампаніі Расіі, каб пазбегнуць празмернага падаткаабкладання ў Расіі, распіхваючы адно аднаго лакцямі, кінуліся ў гэты афшор”. Паводле звестак “Інтэрфакса”, у структуры пастаўшчыкоў на долю «Сургутнафтагаза» прыпадае амаль 30% паставак нафты ў Беларусь, «Роснафты» - 25%, «Сібнафты» - 13%, ЛУКОЙЛа - 11%, «Славнафты» - 10% … Усяго за год на беларускіх НПЗ перапрацоўваецца ад 20 да 22 мільёнаў тонаў нафты. Расія пры цяперашніх стаўках мытаў можа атрымаць у выніку прынятага рашэння дадаткова 3,5-3,7 мільярдаў даляраў у бюджэт. Пры гэтым экспартныя кампаніі страцяць некалькі дзясяткаў мільёнаў.

У той самы час 1,7-2 мільярды даляраў страціць бюджэт Беларусі – і гэта вельмі сур’ёзная страта для рэжыма Аляксандра Лукашэнкі, лічыць “Коммерсант”. Выдаткі ў бюджэце Беларусі складаюць каля 15 мільярдаў даляраў у год – да ўжо запланаванага на 2007 год бюджэтнага дэфіцыту ў краіне дабавіцца яшчэ 10 працэнтаў выдаткаў, альбо 2 працэнты валавога ўнутранага прадукту. Гэта азначае для Беларусі альбо рост запазычанасці, альбо рост інфляцыі, альбо скарачэнне дзяржаўных выдаткаў – альбо ўсё гэта разам.

Па звестках расійскага выдання, палітычнае рашэнне было прынятае 24 лістапада, калі прэзідэнт Пуцін запатрабаваў ад Беларусі прыняць расійскія ўмовы, інакш будуць уведзеныя абмежаванні на пастаўкі расійскай нафты.

Адпаведна, піша газета, што цяпер нават пагадненні па газавым пытанні (нагадаем, што Расія і Беларусь дагэтуль не дамовіліся аб цане на газ), не спыніць гандлёвую і нават палітычную вайну паміж дзьвюма краінамі.

**Аглядальнік**

## КУДЫ ВЯДЗЕ БУМ ГАЛАДОВАК?

### АПЫТАННЕ І КАМЕНТАР

► СТАР. 2,4

## ГАЗ ДЛЯ ЛАРЫСЫ ГРЫБАЛЁВАЙ

### АГЛЯД ДРУКУ

► СТАР.6

# ЯКАЯ ПРЫЧЫНА І ЯКІЯ НАСТУПСТВЫ ХВАЛІ ГАЛАДОВАК У БЕЛАРУСІ?

**ВОЛЬГА ІПАТАВА, ПІСЬМЕННІЦА:**

## “ГАЛАДОЎКА ЁСЦЬ ВЫХАДАМ АДЧАЮ”

Мне здаецца, што адчай апаноўвае людзей, якія бачаць абсалютнае беззаконне ва ўсім. І галадоўка ёсць выхадам гэтаму адчаю, злосці і абражанаму гонару. Усяму комплексу таго, што адчувае чалавек, жывучы ў таталітарным грамадстве, дзе ён не мае ніякай зваротнай сувязі. Што б ён ні гаварыў, ніякія сігналы наверх не даходзяць. І таму адчай, злоба і жаданне хоць унутрана, у сабе самім кампенсаваць гэтую знявагу гонару. А да чаго гэта ўсё прывядзе... Я слухала, калі дэпутат Сяргей Касцян гаварыў у Авальнай зале: “узарвем дзяржаву”. Гэта быў першы раз, калі я цалкам была згодная з ягонымі думкамі. Ён казаў гэта ў звязку з тымі новымі законамі, яшчэ не прынятымі, якія будуць пагражаць людзям яшчэ большымі штрафамі, арыштамі, турэмным зняволеннем, канфіскацыямі і гэтак далей. І ён казаў, што трэба караць тых людзей, якія прыдумляюць гэткія законы. Калі ўжо такі чалавек, як Касцян так загаварыў, то гэта аб чымсьці сведчыць.

**ІНЭСА, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## “ПРА ЯКУЮ ХВАЛЮ ВЫ ГАВОРЫЦЕ”?

А пра якую хвалю вы гаворыце? Ведаю, што галадавалі пратэстанты, Казулін, здаецца, галадаваў. Але гэта супадзенне. Нельга гэтыя акцыі разглядаць як адну вялікую з’яву.

**АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ, ПРАВААБАРОНЦА:**

## “ІНШЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ УЗДЗЕЯННЯ СТАНОВІЦЦА ЎСЁ МЕНЕЙ”

Мне падаецца, што ў сённяшняй сітуацыі галадоўка не выпадкова пачынае выходзіць на першае месца. Бо іншых інструментаў становіцца ўсё меней і меней. Галадоўка становіцца адзіным больш-менш эфектыўным сродкам, які розныя групы грамадства ўжываюць як апошнюю магчымасць дагрукацца да ўладаў і нейкім чынам паспрабаваць паўплываць на тыя ці іншыя рашэнні. На сённяшні дзень, сапраўды, гэта звычайная практыка грамадска-палітычных актывістаў. А да чаго яна прывядзе? Можа быць, да нейкім маленькіх, я бы так сказаў, лакальных перамогаў. Цяжка казаць пра нейкія карэнныя змены пры ўжыванні гэтага сродку. Як праваабаронца я асабіста, канечне, выступаю супраць гэтага сродку. Бо заўсёды здароўе чалавека ў любой сітуацыі для мяне з’яўляецца найважнейшым.

**СЯМЁН БУКЧЫН, ПІСЬМЕННІК:**

## “ГЭТА, НА ЖАЛЬ, МАЛА КАГО ХВАЛЮЕ”

Я не ведаю, ці можна тут гаварыць пра хвалю. Але нават калі пагадзіцца з гэтым тэрмінам, то галоўнае ў тым, ці мае гэтая хваля шырокі грамадскі розгалас. Як у Беларусі, так і за мяжой. Гэта балючае, страшнае і, разам з тым, высокае рашэнне – паказаць цаною свайго здароўя нязгоду з уладамі. Мне здаецца, што ва ўмовах, калі задушаны незалежны друк, гэтыя акцыі не маюць шырокага грамадскага значэння. А прычыны гэтай з’явы такія. Я бачу, што ёсць асобныя асяродкі, невялікія групы людзей, якія схільныя адстойваць сваю пазіцыю такім самазабойчым спосабам. Калі б свой пратэст можна было недзе выказаць, надаць яму нейкі розгалас, дык людзі не йшлі б на такое самаахвяраванне. Але гэта, на жаль, мала каго хвалюе. Паглядзіце на Расію. Для Грузіі ў расійскім друку заўжды знойдзецца месца. “Известия” на траціну паласы пісалі пра скрадзены гадзіннік Кіркорава. А што, галадоўка Казуліна – гэта не падзея? Адзінае, што іх хвалюе – гэта газ, каб хутчэй прывязаць тую Беларусь. І да чаго гэтая хваля можа прывесці, калі яна не мае рэальнай грамадскай падтрымкі? Ёсць людзі самаахвярныя, але яны ў адзіноце. Гэта праўда нашага сённяшняга жыцця.

**ЮРАСЬ, ЛЕКАР:**

## “ГЭТА АПОШНІ СРОДАК ДАВЕСЦІ СВАЮ РАЦЫЮ”

Галадоўка – гэта павольнае самазабойства. Як хрысціянін я не магу яе ўхваліць. Хаця і разумею, што гэта апошні сродак давесці сваю рацыю. Я вельмі быў рады, калі скончылася галадоўка мінскіх пратэстантаў. А зараз вось каталікі ў Гродне дамагліся свайго. Гэта павінна прывесці да больш паважлівага стаўленьня ўладаў да вернікаў-неправаслаўных.

**ВАСІЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## “МОЖА БЫЦЬ, УЛАДА ПАРАЗУМНЕЕ…”

Прычына галадовак зразумелая. Немагчымасць вырашыць пытанні жыцця – ці то рэлігійнага, ці палітычнага, ці гаспадарчага – законным шляхам. Па ідэі, трэба было б спачуваць гэтым людзям. Прычым спачуваць масава. Але штосьці я не чую ў тралейбусах прозвішча Казуліна. І калі царкоўнікі галадалі, таксама не было пра іх чуваць. Гэта пра што гаворыць? Пра нашу абыякавасць. Тады на што і на каго разлічваць галадоўшчыкам? Толькі на спачуванне ўладаў. Можа быць, яны паразумнеюць. Бо ім рэпутацыя забойцаў зусім непатрэбная. Якія б яны ні былі.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## “У ПАЛІТЫЧНЫМ ПЛАНЕ ГАЛАДОЎКІ НІ ДА ЧАГО НЕ ВЯДУЦЬ”

Відавочна, у Беларусі мы назіраем нейкую эпідэмію галадовак. Галадаюць бізнесоўцы, галадаюць вернікі, галадаюць палітыкі. Да чаго гэта прывядзе? Я думаю, што, хутчэй за ўсё, у палітычным плане галадоўкі не прывядуць ні да чаго радыкальнага. Колькі ні было палітычных галадовак, ніводная з іх не дасягнула нейкіх выразных вынікаў. Іншая рэч, што галадоўкі, якія не мелі на мэце нейкіх палітычных задач, раз-пораз прыносяць вынікі. Найперш, галадоўка пратэстантаў. Уладам не было іншага выйсця, як хоць зрабіць выгляд, што яны задаволяць патрабаванні. Вельмі добра скарысталіся сітуацыяй каталікі ў Гродне. Улада адразу ж пачала адступаць. Але казаць пра гэтую хвалю як пра палітычную падзею, якая вядзе да зменаў рэжыму, абсалютна памылкова. Бо там, дзе ідзе галадаванне супраць улады, там яно не мае ніякага поспеху. І можа выкарыстоўвацца, як у выпадку з Казуліным, дзеля піара. І ўвесь плён ягонай галадоўкі – гэта ўласная прэзентацыя для еўрапейскай супольнасці. Палітычныя галадоўкі не маюць падтрымкі ў грамадстве. Тым больш, што ўжо ўсе разумеюць – ніхто ў гэтых галадоўках не збіраецца ісці да канца.

# КАЗУЛІН ВЫХОДЗІЦЬ З ГАЛАДОЎКІ

Пасля 53-х дзён галадоўкі Аляксандр Казулін, які праводзіў акцыю пратэсту ў калоніі “Віцьба”-3, абвясціў аб яе спыненні. Як сказала ў інтэрв’ю Радыё Свабода жонка палітвязня Ірына Казуліна, якая размаўляла з мужам праз тэлефон, “ён ужывае аўсяны кісель і сокі. У яго бадзёры голас і ён кажа, што адчувае сябе нармальна”.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Беларусі Аляксандр Казулін сваёй галадоўкай дамагаўся разгляду беларускага пытання ў Радзе Бяспекі ААН, ці каб адна з краінаў “вялікай васьмёркі” выйшла з такой ініцыятывай. Як стала вядома, прадстаўнік ЗША ў ААН прапанаваў разгледзець на Радзе бяспекі сярод іншых пытанняў сітуацыю ў Беларусі – у тым ліку, у сувязі з галадоўкай Казуліна. Прадстаўнік Расіі адмовіўся нават абмяркоўваць гэтае пытанне. Тым не менш, Казулін, асуджаны на пяць з паловай гадоў турмы, атрымаў за кратамі маральную перамогу.



**Пікет у падтрымку Аляксандра Казуліна** *ў Міжнародны дзень правоў чалавека разганяе міліцыя. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 10 снежня 2006 году.*

# МІЛІНКЕВІЧ: ПРЭМІЯ САХАРАВА БАРОНІЦЬ І КАЗУЛІНА

*12 снежня ў Страсбуры прэзідэнт Еўрапейскага парламента Жазэп Барэль уручыў лідэру аб’яднаных дэмакратычных сіл Беларусі А.Мілінкевічу прэмію імя Андрэя Сахарава «За свабоду думкі».*

Мілінкевіч адмовіўся атрымліваць грошы – 50 тысяч еўра, заявіўшы, што ахвяруе ўсю суму на дапамогу рэпрэсаваным у Беларусі.

У сваім выступе перад дэпутатамі Еўрапарламента Аляксандр Мілінкевіч, які прамаўляў па-беларуску, найперш падзякаваў дэпутатам “за прысуджэнне ганаровай прэміі”.

У сваёй прамове ён, у прыватнасці, сказаў: *“Разам са мной гэтую ўзнагароду атрымліваюць усе беларусы, якія ў сакавіку стаялі на плошчы, сядалі ў турмы, выключаліся з універсітэтаў і з працы...*



**Аляксандр Мілінкевіч**, *Мінск, верасень 2006 году.*

Гэта прэмія і Аляксандра Казуліна , таксама як і Змітра Дашкевіча, і Паўла Севярынца, і Міколы Статкевіча, і Андрэя Клімава ды ўсіх іншых палітзняволеных у маёй краіне. Гэта прэмія – знак неабыякавасці Еўропы да сітуацыі ў Беларусі. Гэта прэмія – прыклад маральнай палітыкі. Гэта прэмія – сімвал прызнання еўрапейскай будучыні Беларусі…

Калі свабоду трэба заслужыць – мы яе заслужылі. Усёй сваёй гісторыяй і ахвярамі, прынесенымі дзеля яе».

Аляксандр Мілінкевіч заклікаў аб’яднаную Еўропу да пашырэння дапамогі грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. Адначасова ён заклікаў не падвышаць для грамадзян Беларусі кошту на шэнгенскія візы.

**Паводле СМІ.**



**«Верым. Можам. Пераможам».** *Прэзентацыя гэтай кнігі,прысвечанай сёлетнім сакавіцкім падзеям на Кастрычніцкай плошчы, адбылася ў сядзібе БНФ. На сустрэчу прыйшлі героі кнігі — найперш,маладыя удзельнікі тых падзеяў. Мінск, снежань 2006 году. Фота pbnf.org.*

## Суседзі

# БЕЛАРУСКІ ШПІЁН ХАЦЕЎ САРВАЦЬ САМІТ НАТА Ў РЫЗЕ?

**У друку пачынаюць з’яўляцца дэталі “шпіёнскага скандалу” з удзелам беларускага разведчыка Сяргея Моніча, які быў затрыманы спецслужбамі Літвы і звінавачаны ў шпіянажы супраць Польшчы.**

Як піша латвійская газета “Телеграф” са спасылкай на прэс-сакратара службы бяспекі SAB Байбу Рату-Саліню, у дні саміту НАТА Латвія стала сапраўднай Мекай для разведак замежных краінаў. Замежных шпіёнаў цікавіла літаральна ўсё, што магло быць звязана з самітам: ад праграмы прадстаўнічага форуму да кантактаў з яго арганізатарамі і ўдзельнікамі. Аднак, як кажуць у SAB, дзякуючы аператыўнай рабоце спецслужбаў, дзейнасць замежных разведак была зведзенная да мінімуму. Адзіным выключэннем стаў выпадак з затрыманнем беларускага шпіёна ў суседняй Літве, пра якога шмат пісалася апошнім часам.

Паводле звестак выдання, агент спрабаваў сарваць сустрэчу кіраўнікоў краінаў Паўночна-Атлантычнага альянсу. Афіцыйна паведамлялася, што затрыманы займаўся ”разведвальнай дзейнасцю ў інтарэсах Беларусі і супраць эканамічных інтарэсаў Польшчы”. Аднак у дні саміту ў Рызе, як сцвярджае латвійскае рускамоўнае выданне, беларускі шпіён нібыта падкупляў літоўскіх і польскіх кіроўцаў-“дальнабойшчыкаў”, каб тыя ехалі ў Расію не праз Беларусь, а праз Латвію. Такім чынам на межах Латвіі, Літвы і Расіі ўтварыліся даўжэзныя шматкіламетровыя чэргі грузавых трэйлераў, – піша газета “Телеграф”.

# АНІ МОВЫ, НІ РАЗМОВЫ

## КУДЫ ВЯДЗЕ БУМ ГАЛАДОВАК У БЕЛАРУСІ?

*Удзельнікі сённяшняга апытання разышліся ў думцы, ці насамрэч у Беларусі мае месца хваля галадовак. У гэтым засумняваўся пісьменнік Сямён Букчын. Хатняя гаспадыня Інэса наагул ніякае хвалі не бачыць. Затое філосаф Валянцін Акудовіч безапеляцыйна гаворыць нават не пра хвалю, а пра эпідэмію галадовак. Напэўна, ён мае рацыю, калі ўлічыць, што галадоўка ў Беларусі перадаецца, як прыклад, ад адной групы да іншай.*

Гродзенскія каталікі не хавалі, што ідэю галадоўкі падгледзелі ў мінскіх пратэстантаў. Калі ж улічыць, што праз галадоўкі ў Беларусі за апошнія гады прайшлі сотні людзей з самых розных сацыяльных груп і што іх пратэсты датычылі цалкам розных сфераў жыцця грамадства – галадавалі прадпрымальнікі, прафсаюзныя актывісты, маладыя і старэйшыя палітыкі, вернікі розных канфесій, — можна казаць калі не пра эпідэмію, дык пра бум галадовак дакладна.

Каб зразумець сэнс гэтай з'явы, заўважым, што галадоўкі пратэсту сучаснае грамадазнаўства трывала звязвае з турмой. Таму, напрыклад, не існуе такой прафесіі – спецыяліст па галадоўках пратэсту, затое ёсць прафесія – спецыяліст па галадоўках пратэсту зняволеных. У турме, сапраўды, ніхто нібыта і не абавязаны да цябе прыслухоўвацца, калі ты зэк. Таму галадоўка там – пэўная форма размовы паміж асуджаным і адміністрацыяй.

Сутнасць нашых галадовак "на волі" – тая самая. Паказальна, што беларускія чыноўнікі, якія спярша адмовіліся ад роднае мовы, цяпер адмаўляюцца ад самой формы камунікацыі з людзьмі праз гутарку, праз дыялог. Таму людзі, якія адстойваюць перад уладай свае правы, вымушаныя выкарыстоўваць такую апошнюю, турэмную "форму размовы" як галадоўка. Людзі выстаўляюць патрабаванні, улада на іх так ці інакш адгукаецца. Пры гэтым яна дае зразумець, што рыса, за якую нельга пераступаць – гэта патрабаванні палітычныя. Мы, чыноўнікі, разумеем, што вас, людзей, можа не стаць, таму і ад нас не патрабуйце, каб нас не было. Вось чаму Валянцін Акудовіч кажа, што палітычная галадоўка ніколі ні да чаго не прывядзе.

Трэба сказаць, што палітычныя галадоўкі і выглядаюць часам па-бутафорску – калі галадаюць на знак салідарнасці адзін дзень альбо абвяшчаюць так званыя эстафетныя галадоўкі – нават паводле назваў гэта больш просіцца ў раздзел здаровага ладу жыцця, чым туды, дзе кажуць пра расцягнутае самагубства альбо пратэст.

Улада, напэўна, вельмі пільна сочыць за тым, каб нідзе пасярод галадоўнікаў не здарылася смяротнага выпадку, і рэгулюе працэс – дзе хутчэй згаджаецца на саступкі, дзе крыху зацягвае час. Калі б нехта недзе памёр, гэта ў кожным разе легла бы плямай на ўлады, паспрыяла б падрыву іх аўтарытэту. Што да саміх галадовак, дык яны, бадай, толькі ўмацоўваюць гэты аўтарытэт, як турэмная галадоўка сведчыць пра "жалезную руку" адміністрацыі, а гэта для турэмнай адміністрацыі безумоўна – плюс. Тое самае адбываецца і ў грамадстве, якое абрала сабе аўтарытарную мадэль улады. Галадоўкі ўскосна мацуюць аўтарытарызм. І ні ў якім разе не вядуць да яго ператтварэння ў дэмакратыю.

**Дэмакратыя складаецца са свабодаў. І сапраўды, калі я магу вольна выказацца і гэта пакажуць на БТ, калі я магу рэальна выбіраць уладу, а калі яна глухая да мяне – перавыбіраць яе, калі я магу стварыць арганізацыю, якая будзе адстойваць мае правы і пажаданні, – калі ўсё гэта будзе, навошта мне галадаваць?**

Дэмакратыя складаецца са свабодаў. І сапраўды, калі я магу вольна выказацца і гэта пакажуць на БТ, калі я магу рэальна выбіраць уладу, а калі яна глухая да мяне – перавыбіраць яе, калі я магу стварыць арганізацыю, якая будзе адстойваць мае правы і пажаданні, – калі ўсё гэта будзе, навошта мне галадаваць?

Бум беларускіх галадовак, між іншым, сведчыць яшчэ і пра тое, што цяперашняя ўлада ў Беларусі на ўсіх узроўнях папросту не здольная гаварыць з людзьмі, выслухоўваць аргументы і пераконваць сваімі. А гэта значыць, што пры змене палітычнай сітуацыі гэтыя канкрэтныя людзі на чыноўніцкіх пасадах не застануцца. Бо ў сітуацыі дыялогу паміж народам і ўладай "турэмнай адміністрацыі" месца не будзе.

**Алесь Кебік**


## БЯСПЛАТНАЯ ПАДПІСКА НА ГАЗЭТУ "СВАБОДА"

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ,
КАЛІ Ў ВАС НЯМА ІНТЭРНЭТУ,
А ВЫ ХОЧАЦЕ РЭГУЛЯРНА АТРЫМЛІВАЦЬ
ПАПЯРОВУЮ ВЕРСІЮ "СВАБОДЫ" ПРАЗ ПОШТУ,
ДАШЛІЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ВАШ АДРАС SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР:
+370 687 42 185
(КОШТ SMS-ПАВЕДАМЛЕННЯ – 150 БЕЛАРУСКІХ РУБЛЁЎ).
ВАШ АДРАС БУДЗЕ ВЯДОМЫ ТОЛЬКІ РЭДАКЦЫІ І ТОЛЬКІ ДЛЯ ПАДПІСКІ

# БЕЛАРУСЬ МОЖА ЗАСТАЦЦА БЕЗ ПРЭМІЯЛЬНЫХ

## ЗА ПАРУШЭННІ ПРАВОЎ ПРАФСАЮЗАЎ ДАВЯДЗЕЦЦА РАСПЛОЧВАЦЦА ЭКАНАМІЧНЫМІ СТРАТАМІ

19-20 снежня пастаянныя прадстаўнікі краінаў Рады Еўропы разгледзяць пытанне аб пазбаўленні Беларусі гандлёвых ільготаў, якімі яна карыстаецца ў рамках Генеральнай сістэмы прэферэнцыяў (ГСП). Беларусь можа пазбавіцца прэферэнцыяў, атрыманых раней ад Еўрасаюза. У выніку гэта будзе каштаваць беларускай эканомікі стратаў у памеры каля 300 мільёнаў еўра ў год. Рашэнне аб выключэнні Беларусі з ГСП раней было прынятае рабочай групай экспертаў ЕС.



**Пасля прафсаюзнага** *мітынгу. Мінск. Фота з архіву.*

Некаторыя СМІ пісалі, што Еўракамісія (урад ЕС) пачала працэдуру пазбаўлення РБ прэферэнцыяў паводле ініцыятывы Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) у сувязі з парушэннем правоў беларускіх прафсаюзаў. Але гэта не зусім так. Падставай стаў зварот іншай аўтарытэтнай арганізацыі — Міжнароднай канфедэрацыі свабодных прафсаюзаў (МКСП), у якую ўваходзяць 156 краінаў. А вось нагодай для звароту стала акурат невыканне беларускім урадам рэкамэндацыяў МАП.

Яшчэ ў 2000-м годзе Беларускі прафсаюз работнікаў аграпрамысловага комплексу, Прафсаюз работнікаў аўтамабільнага і сельскагаспадарчага машынабудавання і некалькі іншых прафсаюзаў паскардзіліся на парушэнні сваіх правоў.

Прафсаюзы скардзіліся на тое, што ўлады РБ прысвоілі сабе права дазваляць альбо забараняць іх дзейнасць, умешваюцца ва ўнутраныя справы гэтых арганізацыяў, прымушаючы іх абіраць лаяльных уладам лідэраў. Усё гэта лічыцца грубым парушэннем міжнародных нормаў – таксама, як і абмежаванне права на забастоўкі ў Беларусі.

Праз нейкі час да скаргі незалежных прафсаюзаў далучылася Федэрацыя прафсаюзаў беларуская (ФПБ). Прыканцы 2003 году МАП накіравала ў Беларусь камісію, якая пацвердзіла факты, якія згадваліся ў скарзе. Міжнародная арганізацыя працы дала ўраду паўгода на выпраўленне сітуацыі. Але ніводная з рэкамендацыяў не была ўзятая пад увагу.

Толькі пасля гэтага МКСП звярнулася ў Еўракамісію з патрабаваннем выключыць Беларусь са спіса краінаў, якія карыстаюцца прэферэнцыямі ЕС. Гандлёвыя льготы ГСП – гэта свайго роду прэмія, якой заахвочваюцца краіны, у якіх паважаюцца правы чалавека і грамадзянскія свабоды (у тым ліку прафсаюзныя). Высокапастаўленыя беларускія чыноўнікі цвердзяць, што у пытаннях прасфаюзнага руху ім навязваюць "чужыя традыцыі".

Але Беларусь уваходзіць у Міжнародную арганізацыю працы з 1954-га году. І пасля ратыфікацыі Канвенцыяў МАП, у тым ліку – Аб свабодзе аб'яднанняў і Аб праве на вядзенне калектыўных перамоваў наша краіна ўзяла на сябе абавязак выконваць права прфасаюзаў абараняць свае правы. Ніхто не прымушаў РБ гэтыя канвенцыі падпісваць. Але падпісаныя міжнародныя абавязацельствы трэба выконваць. А ўрад РБ упарта не жадае гэтага рабіць.

Толькі пагроза страты значнай часткі даходаў у бюджэт з-за выключэння з ГСП прымусіла ўлады зрабіць хаця б выгляд, што яны збіраюцца выправіць парушэнні. Але з другога боку, улады яўна не гатовыя ісці на дэмакратызацыю грамадскага жыцця, паколькі яны баяцца з'яўлення ў Беларусі хоць колькі-небудзь уплывовых незалежных арганізацыяў, а прафсаюзаў – у першую чаргу. Чымсці давядзецца ахвяраваць.

Нават калі ў снежні будзе прынятае рашэнне аб пазбаўленні Беларусі прэферэнцыяў, у сілу гэтае рашэнне ўступіць толькі праз паўгода. Такім чынам, у афіцыйнага Мінска яшчэ ёсць час падумаць.

**Алег Ман**

# "...ГДЕ ТАК ВОЛЬНО ДЫШИТ ЧЕЛОВЕК"

Саюздрук

## АЛЬБО ГАЗ ДЛЯ ЛАРЫСЫ ГРЫБАЛЁВАЙ

Гадавіну развалу СССР газета "Рэспубліка" вырашыла адзначыць вялікім сацыялагічным даследаваннем. З яго вынікае, што беларусы ў большасці сваёй працягваць сумаваць па краіне саветаў.

*"Сегодня в Беларуси распад СССР одобряют всего 17,4 процента, не одобряют 63,4 процента, затрудняются с ответом 19,2 процента. Согласно данным украинской социологической службы крушение СССР одобряет 48,5 процента, не одобряют 33,5 процента, 18 процентов затрудняются с ответом. В России эти цифры таковы: 17,6 — одобряют, 71,8 — не одобряют, 10,6 — затрудняются с ответом. В Казахстане одобряют распад 43,4 процента, в Молдове – 31,5 процента, в Киргизии – 28,5, в Грузии соответственно 76,3 процента".*

А вось каментар да гэтых лічбаў прафесара БДУ Давыда Ротмана: *"Русские люди, как и белорусы, мыслят стратегически, им надо пространство. Это тоже сыграло существенную роль в том, что большинство наших сограждан, несмотря на существенное улучшение жизни (даже по зарубежным данным, 37 процентов белорусов имеют автомобили, когда в Советском Союзе подавляющее число не могло об этом даже мечтать), тем не менее не одобряют распада СССР. Желание жить в большом сообществе, в мире и согласии, думаю, не самая плохая наша черта. Как это кому-то ни покажется парадоксальным, но именно она будет способствовать развитию самосознания, укреплению нашей независимости".*

Цікава, як выглядае гэтае стратэгічнае «пространство», так неабходнае, на думку прафесара, беларусам. Сібір з Далёкім Усходам? Дык ніякіх мяжаў з тою прасторай у нас няма. У Беларусь, хутчэй, вяртаецца «жалезная заслона», якая паўстае не толькі на Захадзе, але й на Поўначы. Тугу па СССР немагчыма патлумачыць рацыянальнымі матывамі. У сённяшняй беднай Грузіі, якая сапраўды ў выніку распаду СССР моцна пацярпела эканамічна, за самастойнасць галасуюць у шмат разоў больш людзей, чым у «квітнеючай» Беларусі. Напэўна, «саўковасць» – гэта стан душы. І яго не выправіш ніякімі заробкамі і аўтамабілямі. І напэўна, прафесар мае рацыю ў тым, што Беларусь можа застацца апошнім жывым кавалкам СССР.

«Рэспубліка» любіць даваць свае старонкі тым прадстаўнікам культуры і шоўбізнэса, якія згаджаюцца лішні раз паказаць сваю лаяльнасць уладзе. На гэтым тыдні пачэсная роля выпала Ларысе Грыбалёвай.

*"Признаюсь честно, меня волнует то, как закончатся переговоры Беларуси и России по формированию цены на газ для нашей страны в будущем году. К слову, я напрямую заинтересована в благополучном исходе – у самой машина работает на голубом топливе. Поэтому внимательно слежу за всеми этапами этого процесса. И хотя трения, касающиеся цены на газ, возникают в конце каждого года, на сей раз, мне кажется, ситуация складывается посложней."*

Хочацца супакоіць Ларысу. Газ у ейным аўто не мае ніякага дачынення да таго "блакітнага паліва", што цячэ па трубах "Белтрансгаза". А больш высокія цэны на электрычнасць, камунальныя паслугі і тавары першай неабходнасці, хочацца верыць, не падарвуць сямейны бюджэт эстраднай спявачкі. Але чаму Расія павінна ставіцца да нас "благасклонней"? З-за таго, што БТ перайшло на мову суседа? За тое, што кіраўніцтва РБ закрыла беларускія школы? За пераслед любых праяваў нацыянальнай свядомасці? За гэта павінны плаціць самі беларусы. Як грашыма, так і будучыняй сваіх дзяцей.

А ў газеце "7 дней" з'явіўся матэрыял пра мінскую тапаніміку, якую, на думку аўтараў публікацыі, даўно пара адкарэктаваць.

*"Вы только вслушайтесь: улица 2-я Шестая линия. На самом деле этот участок городского лабиринта и улицей назвать трудно — здесь лишь несколько старых домов, а ширина проезжей части не всяким машинам позволит беспрепятственно разъехаться. Тем не менее, сей топонимический шедевр продолжает жить, несмотря ни на какие внешние факторы. В том числе для чиновников, принимающих решение о переименовании улиц, не играет существенной роли то, что остальных «линий» уже много лет нет и в помине. Действительно, одно время этот район Минска, около перекрестка современных улиц Куйбышева и Сурганова, удивлял местных жителей и случайных прохожих целой россыпью таких вот несуразиц: Первая линия, Вторая… Вместе с реконструкцией района они исчезли, оставив после себя лишь улицу 2-я Шестая линия...*

І не прыходзіць да галавы журналістам "7 дней", што 2-я Шостая вуліца гучыць нібы музыка ў параўнанні з "правільнымі" назвамі. Што за старой назвай ёсць і гісторыя, і памяць і нават гумар. Што куды больш сорамна для еўрапейскай сталіцы мець вуліцы Леніна, Куйбышава, Кірава, Камуністычную.

**Алесь Канюціч**

# ВЕДАЦЬ СВАІХ ГЕРОЯЎ

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО "ВОСЬ ВЫ І ПАТРАПІЛІСЯ!"

Завяршыў галадоўку пратэсту Аляксандр Казулін. Той, хто сам галадаў хоць бы адзін дзень, хоць бы дзеля аздараўлення, ацэніць учынак спадара Аляксандра. Усе радыёстанцыі кожны дзень спраўна перадавалі: першы, другі... пяцідзясяты дзень галадоўкі. Не ведаю, як каму, а мне дык увесь гэты час не хапала інфармацыі пра самога Казуліна. Варта было б нагадаць ягоную палітычную біяграфію, працытаваць ягоныя перадвыбарчыя выступы. Краіна павінна добра ведаць сваіх герояў.

А куды прапала "Начная Свабода"? 11 снежня не было. Гэта ж любімая перадача! Вось, напрыклад, 6 снежня была вельмі добрая праграма. На госці ў прамы эфір запрасілі маю аднафамільіцу Крысціну Вітушку. Гаворка ішла пра ўзгадаванне дзетак. Прыемна было слухаць людзей, якія ведаюць, пра што гавораць. Калі чалавек штодня ў сям'і гаворыць па-беларуску – гэта таксама адразу пазнаеш у прамым эфіры. Дарэчы, Радыё Свабода шукала, як павялічыць кола маладых слухачоў. Дык можа варта зрабіць адмысловую перадачу для маладых бацькоў? Перадачу пра выхаванне, пра аздараўленне дзяцей, пра хатняе навучанне роднай мове і гісторыі ахвоча слухалі б і маладыя бацькі, і бабулі з дзядулямі.

Моўныя заўвагі. Цікавую перадачу пачало рабіць Радыё Рацыя: "Шалёны агурок". Да вашай смачнай і вялікай бочкі мёду я, назола, усё ж дадам маленькую лыжку дзёгцю. Вядучы Какос кажа да каляжанкі Мандарынкі: "Ну вось ты і патрапілася". Ну, па-першае, няма чаго саромецца слова "папаўся" – у Караткевіча яно, напрыклад, сустракаецца. А яшчэ можна сказаць так: "вось я цябе й злапАў, вось я й раскусіў, што ты там задумала".Скажаце: прыкалваліся, сцябаліся? А я не адчуў.

**Сяржук Вітушка**

# НОЖЫКАМ ПА МІФАХ

Стрэмкі

## НІЯКІЯ ПСІХОЛАГІ НЕ ЗАМЕНЯЦЬ СЯМ'І

Нядаўна ўсе літоўскія СМІ бурна абмяркоўвалі інцыдэнт у адной віленскай школе.

Школьнік стаў біць сваіх таварышаў па чым папала, нават зламаў адной дзяўчынцы руку. А потым, узброіўшыся сталовым нажом, стаў ганяць усіх па калідоры. Настаўніцы пахаваліся па сваіх класах; дырэктарка замкнулася ў сваім кабінеце ды выклікала паліцыю.

Чытач, вядома, уяўляе сабе бамбізу-акселерата, але ўсё адбывалася ў пачатковай школе, і "монстр" з ножыкам – другакласнік!

Неўзабаве высветлілася, што ані пакараць, ані перавесці ў іншую школу псіхічна неўраўнаважанага хлапца не дазваляе закон. Астатнім дзецям застаецца або самім уцякаць у іншую школу, або – цярпець ды чакаць новага выбуху, перад якім зноў будзе бяссільны школьны псіхолаг.

Шырока вядомы нядаўні выпадак у польскай школе, калі дзяўчынка, не вытрымаўшы ганьбы і здзеку з боку аднакласнікаў, павесілася на скакалцы... "Жартаўнікі" і там адкупіліся размовай з псіхолагам – ніякіх іншых мераў закон не прадугледжвае, бач, ім усяго па 14 гадоў.

Не так даўно была прынята Дэкларацыя правоў дзіцяці, якая змяшчае мноства прыгожых і ўзнёслых словаў.

Так ці гэтак, але дзеці цяпер лепш абаронены ад гвалту з боку дарослых, чым раней.

Але яны цалкам безабаронныя перад гвалтам з боку сабе падобных, якіх разбэшчвае беспакаранасць.

Апафеоз гэтай разбэшчанасці назіраўся год таму ў Парыжы, дзе аблытаныя па руках і нагах "гуманнымі" законамі паліцэйскія не маглі цэлы месяц справіцца з нахабнымі зграямі арабскіх падлеткаў, ачмурэлых ад уседазволенасці.

(Нядаўна яны "адзначылі" гадавіну – у Марселі падлеткі зноў падпалілі аўтобус з пасажырамі, былі ахвяры.)

Некалі нам здавалася – вось пабурым савецкую школьную сістэму, што выхоўвала Паўлікаў Марозавых, – і будуць новыя пакаленні вышэй ды чысцей папярэдніх.

Аднак побач з вяртаннем рэлігіі і хрысціянскай этыкі на нас хлынуў такі паток бруду, гвалту і парнаграфіі, што ўжо здзіўляешся, калі бачыш нармальных дзяцей. І ўжо настаўнікі баяцца вучняў, а не наадварот.

Не мае пад сабой глебы і саладжавы міф аб нібыта прыроднай чысціні і дабрыні дзяцей. Не – ад самага пачатку ўсё закладзена ў чалавечай натуры. Пытанне толькі ў тым, добрыя ці злыя пачаткі знойдуць глебу для развіцця.

"Школьны тэрор" – як высыпкі на скуры: не хвароба сама па сабе, а сімптом нядужасці арганізму. Не можа быць іначай у грамадстве, дзе большасць сем'яў – няпоўныя, дзе настаўнік – бедны і бяспраўны.

Феміністкі могуць колькі заўгодна цвердзіць пра самадастатковасць і маральную праватy жанчын. Школы цяпер – амаль выключна ў жаночых руках. Ці сталі яны ад гэтага лепшымі?

Не можа "інь" без "яня", Яніна без Яна, як і Ясь без сяброўкі. І ніхто, ніякія псіхолагі не заменяць сям'ю, дзе маці – клопат і пяшчота, бацька – сіла і справядлівасць.

І грамадства, якое складаецца з кабет, заклапочаных адно сваёй кар'ерай і працай, ды бязвольных п'яненькіх мужчын, асуджана на дэградацыю і самаразбурэнне.

Без моцнай сям'і цывілізацыя пры дапамозе тэлевізара і інтэрнэта гадуе сваіх магільшчыкаў.

Зацкаваны, пасечаны розгамі падлетак з мінулага – і ягоны сучасны раўналетак, што нахабна дыхае ў твар бездапаможнай настаўніцы цыгарэтна-піўным смуродам – што лепш?

Хто знойдзе шлях паміж такімі Сцыламі і Харыбдамі?

А давядзецца шукаць...

**Алег Аблажэй**

# ФОТАФАКТ



*Дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў праводзіць першую экскурсію ў новым музейным будынку.*
***Мінск, 8 снежня 2006 году.***

# Невядомая Беларусь

**14 снежня** 1586 году ў Беларусі ўпершыню ва Ўсходняй Еўропе было зроблена паталагаанатамічнае ўскрыццё нябожчыка. Аб'ектам даследавання стала цела памерлага за два дні да таго кіраўніка краіны Сцяпана Батуры. Спрабуючы вызначыць прычыну ягонае смерці, лекары доўга не маглі прыйсці да згоды. Таму і вырашылі зрабіць ускрыццё, якое ажыццявілі ў каралеўскім замку ў Гродне.

**15 снежня** 1946 году ў Мінску пачаўся суд над ваеннымі злачынцамі, афіцэрамі нямецкае арміі. Паводле прысуду праз паўтара месяца 14 генералаў і афіцэраў будуць публічна павешаныя на беразе Свіслачы ў раёне вуліцы Лодачнай.

**16 снежня** 1918 году ў Вілейцы было абвешчана пра стварэнне Літоўскай савецкай рэспублікі. Такім чынам бальшавікі ўтваралі паўсюль прамаскоўскія ўрады, бо баяліся ўзнікнення незалежных рэспублік. Гэтак Беларуская савецкая рэспубліка была створана ў Смаленску, а Літоўская, як бачым, на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у Вілейцы.

**18 снежня** 1917 году ў Мінскім гарадскім тэатры (цяпер гэта тэатр імя Янкі Купалы) пачаў працу Першы Ўсебеларускі з'езд. Там былі дэлегаты ад усіх мясцовасцяў Беларусі, ад палітычных, вайсковых і бежанскіх арганізацый – усяго 1872 чалавекі. Дыскутавалі пра будучыню краіны, якой яна стане – ці ў складзе Расіі, ці з правамі аўтаноміі, ці зусім незалежная. Урэшце з'езд схіліўся да незалежнасці. Тады бальшавіцкія вайсковыя ўлады, што пільна сачылі за форумам, прымаюць рашэнне разагнаць яго. Што і зрабілі. Тым не менш, Усебеларускі з'езд паспеў абраць свой Выканаўчы камітэт, які абвясціў сябе законнай, абранай народам уладай і прывёў да стварэння 25 сакавіка наступнага, 1918 году незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Блакітны агеньчык

# ВАЙНА ЛЮДЗЕЙ І ЖЫВЁЛАЎ

## ЯНА ІДЗЕ З ПЕРАМЕННЫМ ПОСПЕХАМ

Пачатак снежня на беларускім тэлебачанні прайшоў пад знакам 15-й гадавіны распаду СССР. Садружнасць незалежных дзяржаваў, утвораная 8 снежня 1991 году Белавежскімі пагадненнямі, зараз, пасля правальнага саміту СНД у Мінску, відаць, нікога не цікавіць. Размова вялася менавіта пра Савецкі Саюз.

БТ падрыхтавала да гадавіны адмысловую перадачу – настальгічную трылогію, прысвечаную хаўтурам СССР. "Была краіна: былі людзі", "Была краіна: былі грошы", "Была краіна: была ўлада". Асабліва настальгічнай атрымалася апошняя частка трылогіі. Паўзабытыя персанажы – такія, як расійскі філосаф-фашыст Уладзімір Кара-Мурза, колішні лідэр "Інтэрфронта" з Латвіі палкоўнік у адстаўцы Віктар Алксніс, колішні намеснік Старшыні Вярхоўнага савету Беларусі Васіль Шаладонаў — тлумачылі прычыны распаду вялікай дзяржавы. Дакладней, пралівалі над ёй слёзы. Напрыклад, Віктар Алксніс успамінаў, як 25 снежня спускалі чырвоны сцяг над Крамлём. На Краснай плошчы ў той момант палкоўнік быў абсалютна адзін. Лепшай эпітафіі СССР, бадай, не прыдумаеш.



**Паляўнічыя трафеі** *на выставе "Паляванне і рыбалоўства". Мінск, БелЭкспа. Фота з архіву.*

Нават на фоне сённяшняга, наскрозь ідэалагізаванага Беларускага тэлебачання, перадача выглядала суцэльным анахранізмам. Бо з яе зусім незразумела, а якое дачыненне сённяшняя Беларусь мае да тых падзеяў 1991-га? Словы Рэспубліка Беларусь у перадачы ўвогуле не гучалі. Гаварылі толькі пра Савецкі Саюз, паўтараючы гэтую назву як заклінанне, пры гэтым лаялі на розныя лады Гарбачова, Ельцына, Краўчука, Захад… Як быццам і не было гэтых пятнаццаці гадоў.

А вось "Панарама", да якой усе даўно прызвычаіліся як да рупару афіцыёзу, на мінулым тыдні парадавала сюжэтам пад назвай "Вайна людзей і жывёлаў". Па-першае, у ім гучала беларуская мова (бо сюжэт рабілі ў Жыткавіцкім раёне, у глыбінцы, дзе вясковыя людзі ніякай іншай мовы, акрамя роднай, і не ведаюць). Па-другое, сюжэт выбіваўся са звыклага шэрагу рэпартажаў пра аграгарадкі ды надоі. На добры лад, гэтым сюжэтам можна было б адкрываць інфармацыйную праграму. Распавядалася ў ім пра нашэсце дзікоў, якія апошнім часам (мабыць, з-за цёплай зімы) зусім разбэсціліся ды апанавалі вясковыя гароды, якія бязлітасна вытоптваюць. Шкада толькі, што галоўных вінаватых – саміх дзікоў гледачам так і не паказалі.

Але справа не ў тым. Тамтэйшыя жыхары пачалі пісаць скаргі ў розныя інстанцыі з просьбай да начальства знайсці ўправу на лясных жывёлаў. Але адказу не атрымалі. На завяршэнне сюжэту мясцовы ляснік патлумачыў, што дзікі не лезуць туды, дзе ёсць агароджы. Так што для тых гаспадароў, хто паклапаціўся аб гэтым, няма й праблемы.

Успомніўся чамусьці стары анекдот пра беларускіх партызанаў і немцаў, якія ўсю вайну ваявалі за лесніЧоўку, і тая пераходзіла з рук у рукі. А ў выніку вярнуўся дахаты ляснік і ўсіх разагнаў…

Вельмі моцна засела ў галовах беларусаў мара пра чалавека, які вырашыць за іх усе іх праблемы.

**Максім Пешкаў**

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**ЧЫТАЙЦЕ, ДРУКУЙЦЕ, ДАЙЦЕ ПАЧЫТАЦЬ ІНШЫМ**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў